**УЗНАГАРОДЖАНА:**
**1981 г.** — *Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР*
**2006 г.** — *Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь*

**ЗАСНАВАЛЬНІКІ:**
***Асіповіцкі раённы выканаўчы камітэт*** *(афіцыйны сайт www.osipovichi.gov.by),*
***Асіповіцкі раённы Савет дэпутатаў***

# Асіповіцкі КРАЙ

РаённаяГАЗЕТА
**Заснавана 10 чэрвеня 1931 года**

*"ЗОЛОТАЯ ЛИТЕРА-2012"*

**№ 11** (9863) **10** лютага **2015** г. **АЎТОРАК**

## Поздравляем!

За многолетний плодотворный труд в системе здравоохранения, высокий профессионализм, значительный личный вклад в развитие медицинского обслуживания населения района и в связи с 65-летием со дня рождения Почетной грамотой районного исполнительного комитета награждена **ТИМОШЕНКО Зинаида Алексеевна**, *заведующий (врач-стоматолог) стоматологической поликлиникой учреждения здравоохранения "Осиповичская центральная районная больница".*

## "Прямая линия"

**10 февраля 2015 г. с 11.00 до 12.00** проведет "прямую линию" (тел. 26-9-03) заместитель главного врача учреждения здравоохранения "Могилевский областной центр гигиены, эпидемиологии и общественного здоровья" **КАМИНСКАЯ Елена Федоровна** *по вопросам санитарно-эпидемиологического законодательства.*

## *УВАЖАЕМЫЕ ОСИПОВЧАНЕ!*

**Приглашаем 13 февраля к 10.00** в среднюю школу № 1 г. Осиповичи ветеранов войны в Афганистане, исполнявших свой интернациональный долг за пределами границ своей Родины, членов семей погибших воинов-интернационалистов, жителей района на встречу с руководством райисполкома и литературно-музыкальную композицию, посвященные 26-летию вывода советских войск из Афганистана.

**В 12 часов** на Аллее Героев у памятника воинам-интернационалистам — митинг-реквием.

***ПРИГЛАШАЕМ ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ!***

# Дараганаўскія падарункі

**6 лютага ў раённым гісторыка-краязнаўчым музеі адбылася доўгачаканая падзея: урачыстае адкрыццё экспазіцыі з прадметаў, перададзеных нашчадкамі знакамітага роду Дараганаў. На цырымоніі прысутнічалі Андрэй Дараган і яго жонка Лана, пасол Швецыі ў Рэспубліцы Беларусь Марцін Оберг, намеснік старшыні райвыканкама Аляксандр Шаўлюга, мноства неабыякавых да гісторыі краю землякоў.**



Нашчадкі роду, нямала зрабіўшага для развіцця Асіповіччыны, сёння жывуць у Швецыі і ўжо даволі даўно падтрымліваюць сувязь з нашым краем. А калектыў раённага музея, які ўзначальвае Антаніна Сцяпанава, ажыццявіў даўнюю мару Андрэя, стварыўшы музей сям'і Дараганаў на гістарычнай радзіме.

Праўнук Осіпа Дарагана перадаў музею больш за 300 прадметаў — іх хапіла на афармленне 5 залаў, якія знаходзяцца ў будынку МПЦ "Равеснік". Па словах аднаго з найбольш кампетэнтных спецыялістаў-музейшчыкаў вобласці — дырэктара Магілёўскага бібліятэчнага каледжа Святланы Казловай, каштоўнасць гэтых прадметаў не толькі ў іх старадаўнасці, добрым захаванні, але і ў тым, што яны належалі адной сям'і, дазваляюць на яе прыкладзе прасачыць за падзеямі, якія адбываліся на працягу жыцця некалькіх пакаленняў. Як суцэльны гістарычны артэфакт гэтая сукупнасць культурных каштоўнасцей увогуле бясцэнная, таму Дараганаўская экспазіцыя можа лічыцца адной з найбольш цікавых музейных калекцый Магілёўшчыны.

Апісваць выставу, у якой праз дзіўныя, прыгожыя, звычайныя і незвычайныя рэчы, фотаздымкі, малюнкі перададзены лёс сям'і на фоне самага складанага і неадназначнага перыяду XX стагоддзя — справа няўдзячная. Усё гэта проста трэба ўбачыць — уражанне абавязкова будзе моцным.

Падчас адкрыцця экспазіцыі было цікава назіраць за выразам твару героя дня — Андрэя Дарагана. Тое, як выкарысталі носьбіты яго фамільнай памяці, ён не ведаў, да таго ж, дрэнна валодаючы рускай і беларускай мовамі, у пэўным сэнсе ўвесь час заставаўся сам-насам з уласнымі пачуццямі. Спачатку гэта было здзіўленне, потым — лёгкая разгубленасць, далей — усё больш глыбокая задуменнасць. І раптам у яго вачах заблішчэлі слёзы...

Андрэй Дараган не хаваў прычыны расчуленасці, сказаў пра яе проста і шчыра: *"Я вярнуўся дадому. Гэта неверагодныя пачуццё!"*

Пасля прэзентацыі Андрэй і Лана аднадушна прызналіся, што вельмі ўражаны майстэрствам і далікатнасцю, з якімі супрацоўнікі асіповіцкага музея абышліся з перададзенымі рэчамі, і выказалі намер павялічыць фонды ўстановы за кошт гістарычных прадметаў, захоўваемых у іх прыватным музеі. А яшчэ Дараганы збіраюцца знайсці неабыякавага да асіповіцкай гісторыі мецэната, які б пажадаў дапамагчы ў набыцці рэліквій, волею лёсу патрапіўшых у чужыя рукі, а зараз нярэдка выстаўляемых на міжнародных аўкцыёнах і немалую вялікую цану. Сярод такіх каштоўнасцей — узнагароды Дзмітрыя Дарагана, баявога афіцэра Імператарскага флоту, удзельніка Руска-японскай і Першай сусветнай войнаў.

**Дзмітрый САЎРЫЦКІ.**